# Правілы праходу пасажыраў на станцыі метрапалітэна праз АКП пры аплаце праезду з прымяненнем жэтонаў, пластыкавых карт

Для праходу на станцыі Мінскага метрапалітэна праз турнікет АКП з выкарыстаннем жэтона, праязнога білета на бескантактавай смарт-карце, банкаўскай бескантактавай картцы выканайце наступныя дзеянні:

- падыдзіце да праходу праз турнікет АКП, спыніцеся перад ім, не заходзячы ў створ турнікета;
- пераканайцеся, што АКП знаходзіца у зыходным стане (створы АКП адкрыты, на пярэдняй панэлі гарыць светлавы індыкатар «чырвоны круг» ці «чырвоны крыжык»);
- апусціце жэтон у жэтонапрыёмнік або скарыстайце праязны білет на аснове бескантактавай смарт-карты, банкаўскую бескантактавую карту;
- бескантактавую смарт-карту метрапалітэна паднясіце ў зону счытвання (верхні правы вугал пярэдняй панэлі АКП з лагатыпам «РАДЫЁКАРТА МЕТРАПАЛІТЭНА») на адлегласці не больш за 25 мм;
- бескантактавую смарт-карту дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» або бескантактавую банкаўскую карту паднясіце да валідатара, устаноўленага на верхняй накрыўцы АКП;
- пераканайцеся, што светлавы індыкатар «чырвоны круг» ці «чырвоны крыжык» згас і загарэўся светлавы індыкатар «зялёная стрэлка», а на табло валідатара з’явіўся надпіс «Аплачана».

Прайдзіце на станцыю праз турнікет па праходзе, указаным светлавым індыкатарам «зялёная стрэлка».

Высвечванне на інфармацыйным табло АКП надпісу «СТОП-1» або на валідатары «Адмова» сігналізуе аб тым, што бескантактавая смарт-карта з’яўляецца несапраўднай. Высвечванне надпісу «СТОП-2» або на валідатары «Забарона» сігналізуе аб спробе паўторнага праходу па адной бескантактавай смарт-карце дзвух або больш чалавек па тэрміновым праязным білеце (што не дапускаецца) і кваліфікуецца як неаплачаны праезд. У абодзвух выпадках работнікам метрапалітэна ўстаноўленым парадкам прымаюцца меры рэагавання.

Пры спробе пасажыра прайсці праз турнікет (АКП) пры ўключаным чырвоным светлавым індыкатары на пярэдняй панэлі АКП, створкі турнікета закрываюцца.

Каб пазбегнуць памылковага закрыцця створак пры праходзе праз турнікет, не дапускаецца:

- праходзіць праз турнікет, затрымліваючыся больш за 3 секунды;
- праносіць перад сабой (за сабой) ручную паклажу. Ручную паклажу неабходна прыпадымаць над промнямі фотапрыёмнікаў або праносіць над верхняй накрыўкай АКП. Цяжкую або буйнагабарытную ручную паклажу неабходна праносць праз пункт ручнога кантролю, папярэдне аплаціўшы праезд;
- праводзіць за сабой (прапускаць перад сабой) дзяцей. З малалетнімі дзецьмі неабходна праходзіць праз пункт ручнога кантролю, папярэдне аплаціўшы праезд.

**УВАГА!** Калі пасля размяшчэння ў зоне счытвання бескантактавай смарт-карты чуваць гукавы сігнал, а на інфармацыйным табло АКП высвечваецца надпіс «СКОНЧАНЫ ПАЕЗДКІ», «НЕПРЫДАТНЫ», «НЕ ЧЫТАЕ», «РАНА» - гэта азначае, што ўваход на станцыю не дазволены, а карта не прымаецца турнікетам па адной з прычын:

- карта няправільна выкарыстоўваецца;
- закончаны тэрмін дзеяння карты;
- карта пашкоджана;

- карта закадзіравана наступным месяцам;
- праязны білет дзейнічае толькі ў наземным пасажырскім транспарце.

**Каб пазбегнуць непажаданага спісвання паездак або грашовых сродкаў, неабходна прыкладваць да валідатара толькі тую карту, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд.**

Пры высвечванні на інфармацыйным табло АКП надпісаў «СКОНЧАНЫ ПАЕЗДКІ» або «НЕПРЫДАТНЫ» неабходна звярнуцца да інспектара службы бяспекі або у касы, размешчаныя ў вестыбюлях станцый для праверкі праязнога білета.

Каб пазбегнуць псавання элементаў адзення і ручной паклажы пры праходзе праз турнікет, рэкамендуецца сачыць за элементамі адзення і ручной паклажы для выключэння магчымасці траплення ў тэхналагічныя адтулкі створак і фотаэлементаў АКП.

**Правілы праходу пасажыраў па заканчэнні паездкі праз АКП, размешчаных на выхадзе станцыі**

Пры выхадзе са станцыі каб пазбегнуць памылковага закрыцця створак пры праходзе праз турнікет, неабходна малалетніх дзяцей браць на рукі.

У выпадку немагчымасці ўзяць малалетняе дзіця на рукі неабходна пры выхадзе са станцыі скарыстаць пункт ручнога кантролю.




Для праходу па сумешчаных праязных білетах Мінсктранса, білетах метрапалітэна, бескантактавых банкаўскіх картах.
Для праходу па жэтонах
ЖЭТОН
04-11-2020
16:08:28
ЗВАРОТ ЖЭТОНА